Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

18 ЧЭРВЕНЯ 2016 г. СУБОТА № 115 (28225) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## ПРЫЗВАННЕ ВЯРТАЦЬ ВЕРУ І НАДЗЕЮ

*Работнікам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь*

**Дарагія сябры!**

Сардэчна віншую вас з прафесійным святам — Днём медыцынскіх работнікаў. Самаадданая і нястомна працуючы, вы штодзённа ратуеце і дорыце людзям самае каштоўнае — жыццё. Вы прыходзіце на дапамогу ў самыя цяжкія хвіліны, вяртаючы пацыентам веру і надзею. Ваша прафесія патрабуе вялікай самааддачы, чуласці і цярпення. Гэта ваша прызванне.

Стабільна працуючая медыцынская галіна служыць надзейнай асновай сацыяльнай палітыкі нашай краіны, якая забяспечыла ў апошнія гады рост працягласці жыцця і нараджальнасці насельніцтва, зніжэнне смяротнасці.

Беларуская ахова здароўя славіцца сваімі традыцыямі найвышэйшага прафесіяналізму і міласэрнасці. Інтэнсіўна асвойваюцца перадавыя тэхналогіі, праводзяцца навуковыя даследаванні, ствараюцца новыя лекавыя сродкі, уводзяцца ў строй новыя медыцынскія ўстановы. Дасягненні беларускай медыцыны па заслугах ацэнены не толькі на радзіме, але і далёка за яе межамі.

У гэты святочны дзень ад усёй душы жадаю вам новых перамог і здзяйсненняў у вашай адказнай і высакароднай працы. Няхай няменнай узнагародай за вашу работу будзе ўдзячнасць людзей, якім вы падарылі радасць жыцця і веру ў свае сілы. Жадаю добрага здароўя і дабрабыту вам і вашым сем'ям.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу:**

*«Трэба шчыра сказаць, чаканні ў грамадстве ад пятага Усебеларускага народнага сходу вельмі вялікія. Гэта не нейкае дзяжурнае мерапрыемства. Чакаецца канструктыўная размова, якая вызначае лёс краіны і, вядома, сур'ёзна ўплывае на настрой людзей. Рашэнняў сходу чакаюць і прыхільнікі ўлады, і апазіцыя, і лібералы, і кансерватары. Наперадзе вельмі важная, сур'ёзная работа для таго, каб аб'ектыўна ацаніць рэсурсы, якія мы маем, напрамкі і механізмы аднаўлення эканамічнага і сацыяльнага росту і паставіць напружаныя, але, галоўнае, рэальныя задачы».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 18.06.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 19967,00 | ▼ |
| Еўра | 22465,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 305,17 | ▲ |
| Укр. грыўня | 801,49 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

■ Галоўны капітал

# КАБ МЫ БЫЛІ ЗДАРОВЫМІ

Адна з найбуйнейшых шматпрофільных устаноў аховы здароўя, якая аказвае кваліфікаваную медыцынскую дапамогу не толькі беларусам, але і замежнікам, 10-я гарадская клінічная бальніца Мінска, занесена на Рэспубліканскую дошку гонару пераможцаў спаборніцтваў за 2011-2015 гады і 2015 год.





Сур'ёзныя бюджэтныя грошы былі затрачаны ў папярэднія гады на рэканструкцыю, рамонт, замену абсталявання, няспынную падрыхтоўку і павышэнне кваліфікацыі спецыялістаў у гэтай установе. Цягам года тут цяпер выконваецца каля 20 тысяч хірургічных аперацый, каля 80 тысяч чалавек атрымліваюць меддапамогу амбулаторна і звыш 36 тысяч — у стацыянары. Да паслуг пацыентаў самыя шырокія і даступныя магчымасці па дыягностыцы, лячэнні і рэабілітацыі, а трыццаць гадоў таму на Убарэвіча, 73 адкрыліся два наркалагічныя аддзяленні.

— На базе бальніцы функцыянуе пяць спецыялізаваных рэспубліканскіх цэнтраў — афтальмалагічны, хірургічнай панкрэаталогіі, алергалогіі і прафпаталогіі, таракальнай хірургіі, гастраэнтэралогіі, — адзначае **намеснік галоўнага ўрача па медыцынскай частцы 10-й гарадской клінічнай бальніцы г. Мінска Алена САНКОВІЧ**. — Тут размяшчаюцца яшчэ чатыры гарадскія цэнтры — дыябетычнай ступні, гастрадуадэнальных крывацёкаў, таракальнай хірургіі і традыцыйнай усходняй медыцыны. Адзінае ў краіне гнойнае таракальнае аддзяленне ратуе жыццё пацыентам з ускладненнямі пасля некаторых аператыўных умяшанняў. Для таго, каб выконваць падобныя аперацыі, неабходна мець адпаведныя кадры і самае сучаснае абсталяванне. У нас гэта ёсць.

СТАР. 6

■ Гісторыя газеты — гісторыя краіны

# НА ПАРТЫЗАНСКАЙ, 19

**Налета найстарэйшаму выданню Беларусі — газеце «Звязда» — споўніцца 100 гадоў. Цэлая эпоха! Несумненна, самым складаным перыядам у ёй былі гады Вялікай Айчыннай. Тым не менш, вынік — 4 нумары ў акупаваным Мінску (пяты быў падрыхтаваны, але ў сувязі з масавымі арыштамі падпольшчыкаў так і не ўбачыў свет), 105 сярод непралазных балот у партызанскай зоне на востраве Зыслаў, што на Любаншчыне.**

**Падпольшчыкі і партызаны, якія ў гады Вялікай Айчыннай вайны, у тыле ворага, стварылі друкаваны орган Мінскага падполля, называлі газету цёпла і ласкава — «звёздачкай». Менавіта гэтыя людзі, многія з якіх былі журналістамі, рызыкуючы сваім жыццём і нават ахвяраваўшы ім, зрабілі гісторыю «Звязды» беспрэцэдэнтнай.**

**Якой цаной даваўся кожны выпушчаны нумар, мы не раз расказвалі на старонках «Звязды». Самы час нагадаць і нават раскрыць новыя, невядомыя дагэтуль дэталі, успомніць усіх тых, хто спрычыніўся да гэтай важнай справы, зрабіўшы стагадовы летапіс найстарэйшага выдання краіны не толькі беспрэцэдэнтным, а і ўнікальным.**

СТАР. 5




## ЗАДАВАЙЦЕ ПЫТАННІ, ВЫКАЗВАЙЦЕ ПАЖАДАННІ

**Падчас правядзення пятага Усебеларускага народнага сходу будзе працаваць «гарачая» тэлефонная лінія. 22 чэрвеня 2016 года — з 11.00 да 18.00 гадзін і 23 чэрвеня 2016 года — з 10.00 да 13.00 гадзін.**

**Кожны ахвотны можа патэлефанаваць па шматканальных тэлефонах: 276-00-00, 282-00-00, задаць пытанні, выказаць пажаданні. Код Мінска — 8-017.**